Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczono ryczałtem.

ДА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 4 Вільня, Серада 12-га сьнежня 1928 г. Год 1

Масты спалены*).

Такім чынам і Зьезд Т-ва Беларускай Школы, вызначаны на 9—10 сьнежня, таксама не адбыўся. Калі зьезд 21-га кастрычніка быў самахоць адложаны г. зв. Паўнамочнай Камісіяй, то Зьезд 9 — 10 сьнежня ўжо быў забаронены ўладай.

У вапошні час вельмі цяжка ўжо было правясьці граніцу, дзе пачынаецца ўлада і дзе канчаецца праца г. зв. Паўнамочнай Камісіі, а з ёю разам і тых дзеячоў, якія сталі на пункт гледжаньня г. зв. „санацыі беларуска-польскіх адносінаў“ (як сказаў манархістычна-санацыйны пасол у Сойме п. Мацкевіч). Хадзіла аб народныя гушчы, якія чулі, што штосьці ў Вільні робіцца, што хочуць зманўць сялян і работнікаў, „зьмяніць курс“.

Але факт забароны Зьезду і прысутнасьць у Вільні выбраных на мясцох дэлегатаў, якія прыехалі часткова, ня верачы тэлеграме г. з. Паўнамочнай Камісіі, або ўрэшце не дастаўшы яе.

Гэтыя дэлегаты вочавідкі пераканаліся, куды іх і ўсе беларускія працоўныя гушчы хацелі вясьці тыя, якія хацелі назваць сябе „бацькамі народу“.

Цяпер легенда аб павадырстве разьляцелася ў пыл. Працоўныя беларускія гушчы вуснамі сваіх выбранцаў ясна і акрэсьлена сказалі, што ня ўступяць з свайго шляху барацьбы за свае нацыянальныя, культурныя і сацыяльныя правы. На выразнае зазначаньне аб жаданьні „санацыі“ Т-ва Беларускае Школы яны адказалі дружным, згодным пратэстам.

Ня можа быць двох моваў — Т-ва Беларускай Школы павінна, мусіць быць і будзе культурна-асьветнай арганізацыяй беларускіх сялян і работнікаў. Усякае жаданьне перарабіць яе ў арганізацыю панскіх лёкаяў сустрэне ясны і рашучы адпор усіх беларускіх сялян і работнікаў. Усякі абман масаў раскрываецца.

Маскі з п. п. беларускіх санатараў— сарваны. Усе гэтыя Астроўскія, Каўшы, Шнаркевічы, усе гэтыя г. зв. Паўнамочныя камісіі, усе гэтыя „слупы грамадзянства“ нашлі сваё належнае месца па другім баку барыкады і ў прыхожай паноў.

Масты спалены. Павароту назад няма.

Або народ—або служба паном. Хто выбраў апошнюю дарогу — няхай ідзе. Народ ідзе свaей дарогай да сваей сьветлай будучыні.

*) Гэтая перадавіца напісана, як вынік тых гутарак, якія мелі дэлегаты Т-ва Беларускае Школы з г. зв. Паўнамочнай Камісіяй і аб якіх болей падрабязную справаздачу падамо ў наступным нумары з паданьнем тых пастановаў, якія прынялі дэлегаты.

„Бура без пяруноў“ у нямецкім парляманьце.

(Цікаўная дыскусія ў справе браняносца).

15. XI. у нямецкім парляманьце адбылася цікаўная дыскусія — у справе будовы браняносца „А“. Чытачы беларускай прэсы ведаюць ужо гэтую справу і ролю ў ёй нямецкіх сацыял-дэмакратаў, якія, як большасьць урадавых сацыялістаў дзе інш, павінны круціцца на два бакі: здавальняць адначасна бягучыя патрэбы сучаснай буржуазнай дзяржавы і служыць інтарэсам працоўных масаў, якім часта супярэчаць „інтарэсы дзяржавы“. Так было і ў справе браняносца. Дык нямецкія сацыял-дэмакраты выйшлі з палажэньня такім чынам, што іх таварыш Мюллер, як старшыня нямецкага ўраду, бараніў „інтарэсы буржуазнай дзяржавы“, а іх партыйны таварыш Вэльс—выступіў за ахову супярэчных з імі інтарэсаў і патрэбаў „пралетарыяту“...

Таварыш Вэльс—быццам з прымусу — даводзіў, што будаваць браняносца Нямеччыне нятрэба, бо адзін такі браняносец не абароніць бясьпечнасьці краю, а выкідаць надарма 80 мільёнаў марак — пры ўзрастаючай беднасьці працоўных масаў у краі—няможна.

Калі браняносец мае на мэце небясьпеку з боку Польшчы, дык лепш — пасяліць над польска-нямецкай граніцай — за гэтыя 80 мільёнаў... 40.000 нямецкіх сялян, якія лепш абаранець Усходнюю Прусію ад польскага нападу, як браняносец, які — нічога няварты!

Дасьціпна адзін з дэмакратаў назваў гэтую прамову тав. Вэльса — „бурай без пяруноў“.

Але такіх даводаў, крыўдных для ўраду і ваеннага міністра, ня вытрымаў гэты апошні п. Грэнэр, які зараз-жа вылажыў, што такое гэты браняносец, чаго ён варты дый што можа зрабіць у выпадку „нападу на Нямеччыну з боку суседа, які ўсьцяж павялічвае сваі збраеньні“... Міністар высьветліў, што гэты першы браняносец паваеннай Нямеччыны будзе перавышаць усе іншыя на сьвеце сваей баявой сілай і новай канструкцыяй. Новыя лёгкія маторы—замест паравых машынаў, дадуць магчымасьць мець браняносцу такую артылерыю, якой ня маюць іншыя ў іншых дзяржавах. Ня маючы давольных сілаў на сушы, Нямеччына павінна мець сілу на моры, каб мець магчымасьць цалком ахаваць сваю... нэйтральнасьць у часе магчымай вайны, а тым самым — „запэўніць эўрапэйскі мір“... Міністар не дапускае магчымасьці для Нямеччыны вайны з вялікімі дзяржавамі і з іх флётамі (чытай: з Англіяй), а таму гэты браняносец будзе мець магчымасьць цалком споўніць сваю ролю,—забясьпечаньня для Нямеччыны свабоды руху на Балтыцкім моры ў часе вайны—дзеля абароны проці свайго ўсходняга суседа... Міністар указаў на цяжкае стратэгічнае палажэньне Усходняй Прусіі, адрэзанай на сушы ад рэшты Нямеччыны: браняносец патрэбны дзеля запэўненьня лучнасьці з ёй заўсёды. Указаў і на залішнюю легкасьць усялякага роду нападаў і захватаў—без аховы з боку флёту, чаго прыклады даюць—Вільня, Кляйпэда, Фіумэ... Проці такіх выпадкаў Нямеччына хоча і мае права быць на прышласьць забясьпечана.

Пасьля рэчовай прамовы міністра Грэнэра страшэнна гарачую „баню“ задаў сацыял-дэмакратам пасол-нацыяналіст, які да канца высьветліў усю няшчырасьць іх „партыйна-палітычнага манэўра“. У твар канцлера сацыяліста ён кінуў востра абразьлівую заяву, што—„павадыр партыі, які ня мае адвагі высказаць ясна сваё ўласнае перакананьне, зьяўляецца проста—ніштожжаствам“... Гэтай абразай нацыяналіст справакаваў канцлера, які — ад імя ўраду бо-ж „таварыш Вэльс“ казаў—ад імя С.-Д. Клюбу!..—заявіў ужо рашуча і выразна, што ўрад лічыць канешным стварэньне для Нямеччыны аружнай сілы на моры!..

Гэта заява дазваляе думаць, што навет сучасны ўрад, з сацыялістамі на чале, выкарыстае цалком тыя магчымасьці, якія дае Нямеччыне ў галіне стварэньня аружнай сілы на моры Вэрсальскі Трактат, дазваляючы ёй мець 4 браняносцы!

Такім чынам — усьлед за „браняносцам А“ пойдуць і далейшыя... літэры альфабэту.

—·—

Цікаўныя артыкулы ў справе браняносца зьмяшчае нямецкая нацыяналістычная прэса, якая, зразумела, яшчэ больш адкрыта, чым ваенны міністар, кажа аб тым, дзеля чаго будуецца браняносец. Даўшы падробязнае апісаньне нязвыклай новай сыстэмы і сілы новага браняносца, артыкулы марскіх фахоўцаў кажуць далей і аб яго далейшым ужыцьці.—На выпадак аружнага канфлікту з Польшчай, кажа адзін з артыкулаў, Францыя—паводле саюзных абавязкаў — кіне частку свайго флёту на ратунак Польшчы. Але, маючы найвялікшую для сябе пагрозу на Сяродземным моры з боку чакаючай толькі на „суадказны мамэнт“ Італіі, Францыя здолее выслаць у Балтыцкае мора толькі малыя крэйсеры—ня больш 10.000 тоннаў, якія ні з якога боку ня здолеюць раўняцца з нямецкім браняносцам. Такім чынам новы браняносец адыграе вялізарную, першарадную для Нямеччыны ролю — на выпадак вайны з Польшчай: ён рашуча спыніць усялякі давоз з боку Францыі ваенных матэрыялаў для Польшчы—марскім шляхам...

—·—

Як ведама з тэлеграмаў, нямецкі парлямант адкінуў прапазіцыю сацыял-дэмакратаў і зацьвердзіў будову „бран. А“, а тым самым адабрыў і далейшую—разбудову нямецкага флёту. За прапазіцыю галасавалі толькі Сац.-Дэмакр. і кам[illegible]. „Сацыялістычны гонар“ С.-Д. такім [illegible] — лічыцца ўратаваным...

Да змаганьня з голадам!

Толькі таму і мог існаваць наш селянін, што мае выробленую вякамі надзвычайную працавітасьць, здольнасьць дастасоўваньня да нялюдзка цяжкіх умоваў, сацыяльных абставінаў і ўменьнем задавальняцца няшмногім. Бо якое можа быць жыцьцё селяніна в 6 — 8 чал. сям'і на 3 — 4 дзесяц. неўраджайнай зямлі? (Лепшая зямля ў панскіх маёнтках). Раней была ці то магчымасьць выхаду на заробак у вялікія прамысловыя гарады, як Петраград, Масква, Рыга і інш., ці то магчымасьць эміграцыі ў Амэрыку. Цяпер-жа ўсё гэта адцята, а агульнае абяднеьне краю дабівае зьбяднеўшых сялян. Павялічэньне і падзел сем'яў звужае і да таго вузкія сялянскія палоскі, а сыстэма асадніцтва не дае магчымасьці беларускаму селяніну карыстаць ад вякоў да яго належачай зямлёй, як дворная ці дзяржаўная.

Нялюдзкія варункі існаваньня нашага селяніна за апошнія некалькі гадоў пагоршыліся да нябывалых разьмераў. Стыхійныя катастрофы і няўраджай, — асабліва ў гэтым годзе, — што адведалі Заходнюю Беларусь, дабілі нашага селяніна. У многіх мясцовасьцях сяляне ўжо ня маюць хлеба, не гаворачы ўжо аб запасе на насеньне; нястача корму змушае селяніна прадаваць апошнюю жывёлу за трэйцюю або чацьвёртую частку вартасьці яе! Гэтак цяпер, у пачатку зімы! А што будзе вясною?! — Галодная сьмерць глядзіць у вочы вёсцы!

Дзе ратунак, дзе выхад?—У гэтым няшчасьці [illegible], не спадзяючыся на другіх, разьлічваць толькі на самых сябе! Павінны арганізаваць сваю самапомач, павінны арганізаваць свае **Галодныя Камітэты** (Камітэты для помачы галодным), якія павінны знайсьці спосабы і срэдствы, каб прыйсьці на спатканьне галодным сялянам. Заходняя Беларусь мусіць пакрыцца сеткаю камітэтаў на чале з Цэнтральным у Вільні, — далей акружныя—у паветах і раёновыя у гмінах. Акцыя камітэтаў мусіць вясьціся, як у краі так і заграніцай, як Амэрыка і інш.

Камітэты мусяць у краі дабіцца:

1) **Дзяржаўнай помачы для галодных, як хлеб, корм, інвэнтар, насеньне і інш.**

2) **Дзяржаўных беззваротных пазыкаў для працоўных сялян.**

3) **Звальненьня галодных сялян ад падаткаў і пералажэньня іх на маючыя клясы.**

4) **Скасаваньня ўсіх даўгоў і залегласьцяў у розных дзяржаўных банках.**

Дык да працы, браты!

З палітычнага працэсу у Навагрудку.

Другі дзень працэсу распачаўся—допытваньнем сьведкаў абвінавачваньня. Усе яны, разумеецца, падтрымвалі (popierali „Słowo“ з 29. XI) акт абвінавачваньня.

Між іншымі, сьведка Кухаркоўскі, тагачасны навагрудзкі заступнік старосты, паказваў, што адозвы 39 нумару заключалі ў перадвыбарным часе замаскаваныя лёзунгі, быццам даныя тайным акольнікам ЦККПЗБ, дзеля таго, каб усьцерагчы ад канфіскаты адозвы, аўтарамі якіх, кажа сьведка, былі пас. Стагановіч і Раманюк.

З боку абароны паказваў сэн. Рагуля. Гаворачы аб сьпіску № 39, сьведка кажа, што, хоць гэта сьпісак і быў яго палітычным праціўнікам (як сельсаюзьніка), аднак, лічыць яго за беларускі радыкальна-нацыянальны сьпісак, фундамэнтам якога зьяўляюцца сацыяльныя пачаткі. Характарызуючы пасла Стагановіча, сьведка сэн. Рагуля кажа, што ня лічыць за камуністычнага дзеяча; аб рэшце кандыдатаў гэтага сьпіску (39) кажа, што яны ня маюць рашучага палітычнага абліччa (бязглузьдзіца,—бо-ж нядаўна казаў: гэта радыкальна-нац. беларускі сьпісак.—Рэд.). Аб Т-ве Бел. Школы Рагуля адзываецца, як аб арганізацыі, у якую ўваходзяць элемэнты ад крайня ўгадовых да крайня радыкальных, але не камуністаў.

Па паказаньнях сэн. Рагулі, адвакат Сьмяроўскі просіць унясьці ў пратакол факт, што дзяржаўныя ўрадоўцы, будучы на сваіх пасадах ужо па некалькі гадоў, ня ведаюць беларускай мовы, бо, як самі кажуць, ня інтарэсуюцца гэтай мовай. Далей, піша наз. газэта, абарона ў сваіх пытанях да dowodowych“ сьведкаў старалася давясьці, што акт абвіненьня збудаваны толькі на выведах паліцыі і на канфэдэнцыянальных (дэфэнзыўных—Рэд.) даных, пазбаўленых фактычнага матэрыялу.

Ці ўдалося гэта абароне, ці мо' і не, нешта „Słowo“ нічога ня кажа (а маўчаньне—знак згоды)...

Трэці дзень працэсу занялі паказаньні толькі 3-х сьведкаў абвінавачваньня. Першы сьведка—нейкі Янкоўскі, „былы дзеяч і „zaufany“ камуністычнай партыі“, між іншым, кажа, што ён „стыкаўся“ з усемі падсуднымі і, быццам Ан. Малец быў інструктарам зброі на 3 паветы, кіраўніком баявой арганізацыі і старшынёй і галоўным дзеячам Навагрудзка Райкому, лічыўшага ў сабе аж 80 ячэяк, а ўся рэшта абвінавачаных, кажа сьведка, „былі або старшынямі ячэяк, або агітатарамі **ў выбарным часе за сьпісак № 39**, (падчыркненьне наша—Рэд.) тэрорам змушаўшымі беларускае насельніцтва галасаваць за гэты сьпісак“.

Другі сьведка, нейкі Цвырко-Годыцкі, кажа, што дзейнасьць Мальца (арганізацыя ячэяк) распачалася пасьля зьліквідаваньня Навагрудзкага Райкому. Галоўная ўвага быццам прысьвячалася зьбіраньню зброі. І калі сьведка прышоў з паліцыяй арыштоўваць Мальца, Альшэўскага і Дубровіча, дык, кажа, знайшоў там 2 рэвольвэры.

Але найбольшую сэнсацыю з паказаньняў гэтага сьведкі зрабіла тое, што ён кажа, быццам „у часе вядзеньня аднае справы, ён усталіў, што Пас. Стагановіч, ужо вышаўшы з турмы (будучы пaслом), навязаў пры помачы не зьліквідаванай ячэйкі ў вёсцы „Х“, каля Рубяжэвіч, кантакт з радавым ГПУ, дзеля зарганізаваньня зьліквідаванага Навагрудзкага Райкому“.

У далейшым працягу паказаньняў Годыцкага, падсудны Малец зазначае, што яго білі і вымушалі прызнаньні катаваньнем.

Аб Міхалоўскай („Шура“) сьведка кажа, што праўдзівае яе прозьвішча ня сьцьверджана, а яна сама не прызнаецца ні да чаго, апрача прыналежнасьці да партыі. Гаворачы аб Аляшкевічу, старшыні Навагрудзкай Акружной Управы Т-ва Бел. Школы і кіраўніку беларускай кнігарні, сьведка кажа, што ён належаў да А. К. партыі.

Аб Т-ве Бел. Школы адзываецца, як аб арганізацыі, пераняўшай грамадаўскія лёзунгі, да якой, кажа, маюць загад уступаць аддзельныя сябры КПЗБ, каб забраць у свае рукі ўладу. У канцы сьведка кажа, што КПЗБ ужывае да ўсіх сваіх сяброў тэрор і, што ён будзе ўжыты і да сьведкаў абвінавачаньня цяперашняга працэсу.

Па паўдні паказваў 3-ці сьведка абвінавачаньня—кіраўнік сьледчага аддзелу асьпірант Крэмэр. У часе яго гутаркі аб Т-ве Белар. Школы, што яно апанавана камуністамі і што сьпісак „39" быў замаскаваным сьпіскам № 13 (камуністычны) адв. Сьмяроўскі задаваў сьведцы пытаньні, на якія ён не „zupełnie odpowiadał". Тады адв. Сьмяроўскі заявіў ад імя абароны: „мы заскочаны, як юрысты і як сябры вымеру справядлівасьці, што кваліфікацыя (акрэсьленьне—Рэд.) віны аддана ў неадпаведныя рукі".

Адв. Гонігвіл таксама задаваў цэлы рад пытаньняў, адносна апанаваньня Т-ва Белар. Школы камуністамі, з якіх прэса (Słowo № 276) падае толькі наступныя:

Адв. Гонігвіль: „Прашу сьведку назваць 15 камуністаў, працуючых у Т-ве Бел. Школы". Пракурор дамагаецца ўхіленьня гэтага пытаньня пры поўнай салі, што суд і зрабіў.

Адв. Гонігвіль: „Дык прашу пакінуць залю". Пракурор спраціўляецца таксама. Адв. Гонігвіль: „Па гэтай прычыне мы ўсе выйдзем, хай сьведка скажа гэта самому суду".

Суд ухіліў (скасаваў) і гэтую прапанову. Далей адв. Сьмяроўскі пытаўся, ці ёсьць якія довады, або акты, аб кантакце пас. Стагановіча з ССРР, бо, кажа, „гэта вялікі закід, высунуты толькі цяпер, які трэба абавязкава спьвердзіць".

Наступна паказвала яшчэ 3 сьведкаў абароны, але на буржуазную прэсу яны зрабілі „ўражаньне вывучаных" — „бо-ж пакуль ім зададуць пытаньне, яны на яго адказвалі ўжо „zgóry". Вельмі ясна, што для абшарнікаў усё беларускае зьяўляецца „камуністычным і вывучаным", але калі беларускія сяляне маглі „вывучыць наперад" судовыя ці пракурорскія пытаньні, то чаму-ж пракураторыя ня можа „вывучыць наперад" і сялянскіх адказаў, — і гэтым не задаваць ім пытаньняў, адпаведных іх „вывучанасьці"?..

4-ты дзень працэсу распачаўся паказаньнямі сьведкаў абароны, з якіх першае мейсца займае пас. Белар. Сял.-Раб. Пас. Клюбу Гаўрылік. Паказаньні пасла Гаўрыліка „Słowo" (№ 277) наз. „абвіненьнем пад адрасам польскай дзяржаўнасьці, а пахвальным гімнам аб беларускім раю ў бальшавіі".

„Сьведка выказаў цэлыя гімны на тэму самых найразнастайных льготаў і поступу, якія беларусы маюць у Радавай Беларусі і ў канцы заявіў: „нічога дзіўнага, што камунізм цягне нас і мае ўплывы на масы. У Расеі мы маем фэдэратыўную рэспубліку". У гэтым мейсцы пракурор просіць суд упісаць у пратакол гэты сказ. Наступна пасол Гаўрылік кажа, што партыя пад назовам: „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў" ёсьць самаабаронай проці цяперашняй сыстэмы ўраду, а мэтай гэтай партыі ёсьць здабыцьцё незалежнасьці для беларускага народу. „Наагул", піша наз. газэта, „уся прамова пас. Гаўрыліка рабіла ўражаньне, што яна гаворыцца дзесь у „бальшавіі" і мела характар мітынговай прамовы" (ясна, што ў вачох абшарніцкай прэсы іначай быць ня можа—Рэд.).

Сьв. Чатырка гаворыць, што працуючы ў Т-ве Белар. Шк. Аляшкевіч і пас. Стагановіч далі дужа прыкладаў сваей ахвярнасьці.

Сьведка Гутовіч, „obywatel" (шляхціц) з Навагрудзкага пав. сусед Стагановіча, адзываецца аб ім прыхільна, кажучы, што ён, Стагановіч, быў добрым грамадзкім дзеячом і досьць добра адносіўся да „земяньства". Тое самае кажа і сьв. Сеножэцкі, дзеяч ральнічых арганізацыяў.

У канцы, абарона ўнясла прапазіцыю, далучыць да актаў справы Статут Т-ва Бел. Школы, апіраючыся на тым, што арганізацыя і мэты Т-ва Белар. Школы не даюць магчымасьці сваім сябром вядзеньня якойсь палітычнай працы, а большасьць падсудных якраз і належыць да Т-ва Белар. Школы.

Чацьверты (і апошні) дзень працэсу закончыўся апошнім словам падсудных. З прамоў падсудных прэса („Słowo" з 6/XII) успамінае толькі аб прамове Антося Мальца, сына Васіля, які „пачаў гаварыць агітацыйную прамову, дзякуючы чаму ў яго было адабрана слова. Аднак, падсудны прамаўляў далей, і ня гледзячы на тройчую ўвагу старшыні спыніць прамову. Тады старшыня распарадзіўся вывесьці (usunąć) абв. Мальца з салі".

А 12 гадз. суд пашоў на нарады і праз 4 гадзіны вывес такі прыгавор:

На 8 гадоў цяжкага вастрогу і паняседьне судовых коштаў засуджваюцца: Уладз. Грыц, Антось Малец, (с. Васіля), Міхалоўская (псэўд. „Шура"), Кандрацюк і Нестар Андраюк.

На 4 гады цяжкага вастрогу і зьвярненьне судовых коштаў: Антось Малец (сын Якуба), Янка Дударэвіч, Янка Лустач, Уладз. Чужаземец, Лукаш Яўстаха, Павал Хвасько, Ант. Мачыла і Уладз. Журка.

„Па прачытаньні прыгавора з боку засуджаных пачуліся дэманстрацыйныя выкрыкі, аднак, іх зьліквідавала паліцыя". Пракурод Ходэцкі падаў проці прыгав. апэляцыю.

Рэшта падсудных, у тым ліку і пасол Стагановіч,—апраўданы.

З Сойму.

30. XI. адбылося чароднае агульнае паседжаньне Сойму і цэлага раду соймавых камісіяў.

Агульнае паседжаньне Сойму распачалося т. зван. справай аплявухаў, даных ў соймавых кулюарах бэбэхоўскім паслом Палякевічам украінскаму паслу Хруцкаму. Пас. Лявіцкі (ўкр.) заявіў, што „хоць паслы нац. меншасьцяў і наражаюцца на фізычныя напады, аднак, гэта іх не адстрашыць ад выконваньня абавязкаў, дыктаваных уласным сумленьнем і воляй выбаршчыкаў". Далей, з прычыны, што гэта адбылося ў будынку Сойму і абражае яго павагу, і што абавязак пільнаваньня павагі і спакою ў Сойме ляжыць на марш. Сойму, пас. Лявіцкі зьвяртаецца да апошняга ад імя свайго Клюбу з пытаньнем, як ён мяніцца бараніць павагу Сойму ад падобных выпадкаў і што ён думае зрабіць, каб запэўніць паслом асабістую бясьпечнасьць на абшарах Сойму.

На заяву Лявіцкага кн. Радзівілл ад Клюбу „Бэ-Бэ„ адказаў, што гэта справа не палітычная (ўкраінцаў і палякаў), а асабістая. Тое ж самае сказаў і маршалак Сойму Дашынскі: „гэта ня быў выпадак характару палітычнага паміж двумя народамі, а характару канфлікту паміж 2 пасламі.

У далейшым працягу Сойм доўга разглядаў справу прызнаньня студэнтам польскіх унівэрсытэтаў тытулу дактароў. У канцы прыняты ўвёсак, што студэнты юрыдычных факультэтаў Львоўскага і Кракаўскага ўнівэрсытэтаў і мэдыцынскіх фак. усіх унівэрсытэтаў Польшчы карыстаюць па зданьні экзаменаў да 1932 году з тытулу доктара. Бэ-Бэ і М-ва Асьветы хацела, каб тытул доктара атрымлівалі толькі тыя студэнты, якія па сканчэньні ўнівэрсытэту аддаюцца навуковай працы, а ня тыя, якія йдуць і на прафэсіянальную працу.

Разгледзеўшы яшчэ некалькі дробных справаў, вызначана наступнае паседжаньне на сераду 5. XII. г. г.

З соймавых камісіяў працавалі: камісія зямельных рэформаў, скарбовая, асьветы і бюджэту. Камісія Зям. Рэф. разглядала трэцяе чытаньне праекту ўставы аб упарадкаваньні праўнага стану ў Браслаўшчыне і Дукштанскай вол. (Сьвянцянск. пав.) у межах зямельнае рэформы.

Скарбовая камісія толькі падзяліла рэфэраты паміж аддзельнымі пасламі. Камісія Асьветы выслухала толькі 1 рэфэрат пасла Пруxніка.

Бюджэтная камісія разглядала бюджэт Найвышэйшай (Izby) Кантролі Дзяржавы і ў „uznanie" да працы старшыні гэтай установы, праф. Врублеўскага, „jednomyślnie" прызнана яму ў бюджэце на будучы год 20 тысяч злотых на рэпрэзэнтацыйныя выдаткі „dla prezesa" (зазначаем, не для Установы, а для „прэзэса" асабіста)... Цікава, ці прызналі-б гэтыя панове гэтую суму, калі яна хоць крыху дакратвалася-б да іх кішані?!.

— —

5 г. сьнежня адбылося чароднае (35-ае) агульнае паседжаньне Сойму. Адзначылася яно сваей „жэчовасьцю" ці, іначай кажучы, адсутнасьцю т. зв. „палітычных мамэнтаў"— гэта ёсьць поўным супрацоўніцтвам Сойму з Урадам, дапяць чаго так доўга і энэргічна (не шкадуючы „адпаведных" засобаў) імкнуўся цяперашні санацыйны ўрад, а проці чаго пярунавала (і цяпер яшчэ пяруне) ўся польская т. з. „лявіцовая апазіцыя".

Відаць, што ўрад ужыў ці напаў на адпаведныя „argumenty przekonywójące", калі так заядла бараніўшая (на паперы!) польскія працоўныя масы ад „буржуазнага ўраду", польская сацыял-здрадніцкая „апазіцыя", ужо патроху прыступае да супрацоўніцтва з гэтым-жа „буржуазным урадам".

Але вяртаемся да „жэчы".

Паседжаньне распачата чытаньнем закону аб прызнаньні ўласнасьці былых арэндатараў на абшарах Усход. Ваяводзтваў. Справаздаўца заявіў, што ўрад не падтрымлівае сваіх паправак, паданых ім на папярэднім паседжаньні, але праваліўшыхся тады дзеля таго, што іх не падтрымалі свае-ж бэбэхаўцы, вышаўшыя з салі ў часе галасаваньня над імі. Устава прынята галасаваньнем толькі з адной малой папраўкай.

Далей галасаваньнем прынята ўстава аб прадаўжэньні тэрміну здаваньня дактаратаў (экз. на тытул доктара) да 30 чэрвеня 1932 г. Гэтыя экзамены будуць здавацца паводле старое сыстэмы.

Наступна разглядалася справа вучыцельскіх экзаменаў. Прадоўжана на 2 гады апошні тэрмін здаваньня кваліфікацыйных экзаменаў вучыцялямі сярэдніх школаў (тэрмін меўся скончыцца 30 чэрв. 1929 г.); далей 147 галасамі проці 121 адкінута прапазіцыя ўкраінскага клюбу аб зраўнаньні заграничных дыплёмаў з краёвымі і пэпэесаўскі ўнёсак аб прызнаньні роўнасьці дыплёмаў „Польскай Вольнай Wszechnicy" ў Варшаве з дыплёмамі іншых польскіх вышэйшых школаў.

Пасьля прыняцьця цэлага раду драбнейшых справаў, Сойм прыступіў да разгляду ўставы аб ратыфікацыі (зацьверджаньні) італьянска-польскага дагавору ў справе сплаты даўгоў, зробленых Польшчай у Італіі. Яны былі зроблены ў 1918, 19 і 1920 гадох на пакрыцьцё даставы ваеннага матэрыялу і транспарту.

Устава прынята. Па адлічэньні заплачаных, астаецца яшчэ заплаціць 87,625,000 лір. Сплата разложана да канца 1930 году; што месяца будзе плаціцца па 60,000 даляраў, а рэшта выраўноўвацца ў канцы кожнага паўгодзьдзя.

Наступна разглядалася справа кантролю над гандлем зброяй і выяўленьня гэтага гандлю. Апошняе (выяўленьне) мае быць дапята дарогай квартальных (трохмесячных) справаздаваньняў, абвяшчаных кожнай дзяржавай.

„Але, дзеля таго, што ССРР не прыступіў да гэтай канвэнцыі, дык і суседнія з ім (Радавым Саюзам) дзяржавы, а пасярод іх Польшча, звольнены ад такіх справаздаваньняў аж да часу, пакуль ССРР ня зьменіць свайго становішча"—значыць, суседнія з Радамі дзяржавы павінны неаграмічана зброіцца... хоць і ёсьць „проціваенныя" пакты.

Але найбольш цікавым і характэрным мамэнтам для цяперашняга „лявіцова-апазіцыйнага" Сойму быў разгляд урадавага перабору бюджэту з 1927-28 бюдж. году.

У канцы выясьнілася, што Урад падасьць Сойму ў гэтай справе праект уставы аб дадаткавых крэдытах на другім чытаньні бюджэту на будучы год. Польскія эндэкі падалі прапазіцыю соймавай меншасьці, каб тэрмін гэтай падачы быў вызначаны да 15 сьнежня. Санацыйная прэса піша, што мэтай гэтай прапазіцыі было „прыціснуць Урад да муру". Аднак, з гэтай бяды Урад выратавала польская лявіца і жыды, галасамі якіх разам з „Бэ-бэ" проці эндэцы, беларусаў, украінцаў і камуністаў, прапазіцыя была адкінута.

І вось, як піша санацыйная прэса, Урад ужо дасяг „жэчовага" супрацоўніцтва Сойму з сабою.

Абвясьціўшы, што дзякуючы адсталасьці ў працы некатарых камісіяў, з прычыны сканцэнтраваньня іх увагі на працы бюджэтнай камісіі, марш. Сойму зачыніў паседжаньне, зазначыўшы, што з гэтых прычын ён ня можа вызначыць дня наступнага паседжаньня, а паведаміць аб гэтым потым.

З ГАЗЭТ.

Аб так званым „крызісу" ў ССРР.

У сувязі з падгатоўкаю вайны імпэрыялістаў усяго сьвету супроць ССРР, буржуазная прэса праз увесь час алярмуе аб голадзе, аб заняпадзе прамысловасьці, агулам аб гаспадарчым „крызісу" ў Радавым Саюзе. Гэтыя крыкі зьяўляюцца нічым іншым, як адным з спосабаў падгатоўкі вайны, бо маюць за мэту затуманіць вочы працоўным перад запраўднасьцю і паказаць ім, што сяляне і работнікі ня могуць кіраваць гаспадарствам. Але паміж гэтых крыкаў часамі мімаволі прабіваюцца кветачкі, якія гавораць самі за сябе і дэмаскуюць усю брахню капіталу. Так „Эпока" з 23-Х г. г. у артыкуле „характар нашага загранічнага балянсу", між іншым, піша:

„На рынку баваўняных вырабаў зьявіўся паважны для нас канкурэнт — ССРР. Ён стараецца экспансыўным спосабам вывозіць свае танныя баваўняныя вырабы, што яму ў апошнія гады ў значнай меры ўдаецца. ССРР вывозіць у краі Блізкага і Далёкага Усходу, а таксама ў краі азыяцкага кантынэнту. У 1923 — 1924 г.г. вываз баваўняных вырабаў ССРР выносіў ледзь 650.000 руб., а ў 1926 — 1927 г.г. 20.913.000 руб., а ў першай палове 1927 — 1928 г.г. 28.500.000 руб. ССРР імкнецца таксама апанаваць балтыцкія рынкі".

Як бачым, гаспадарчае жыцьцё ў ССРР разьвіваецца шпаркім тэмпам. А аб „крызісах" буржуазная прэса крычала і будзе крычаць. Гэта яе заданьне.

Залажэньне спажывецкага каапэратыву на вёсцы.

PROTOKOŁ

Walnego Zgromadzenia założycieli Spółdzielni Spożywców we wsi Piereczy, gminy Hołyńskiej, pow. Wileńskiego z odpowiedzialnością udziałami, odbytego w dniu 20 listopada 1928 r. w domie № 45 Jana Borody.

Zgromadzenie zagaił o godzinie 12 p. Michał Lebieda w obecności 53 osób. Na przewodniczącego Zgromadzenia powołano p. Leona Sachę, na assesorów pp. Dziemjana Wialikiego i Szymona Koladę i na sekretarza p. Bazylego Czornego. Poczem został odczytany następujący porządek obrad Zgromadzenia:

1) Zagajenie i wybory przewodniczącego, assesorów i sekretarza,

2) Pogadanka: „Cel i zadania Spółdzielni Spożywców",

3) Omówienie zasad statutu Spółdzielni,

4) Rozdanie deklaracyj członkowskich i podpisania ich przez obecnych,

5) Przyjęcie i podpisanie Statutu:

a) ustalenie terenu, siedziby i nazwy spółdzieini,

b) wysokość wpisowego,

c) wysokość udziałów,

d) ilość członków Rady,

6) Wybory Rady Nadzorczej,

7) Oznaczenie najwyzszej sumy zobowiązań Spółdzielni,

8) Wolne wnioski.

Po przyjęciu porządku obrad p. Drozd Aleksy zapoznał zebranych z celem i zadaniami Spółdzielni spożywców.

P. Socha Leon odczytał i wyjaśnił poszczególne artykuły statutu wzorowego Spółdzielni spożywców.

Rozdano deklarację i po przerwie zadeklarowało chęć przystąpienia do Spółdzielni 53 osób.

Uchwalono jednomyślnie do statutu wzorowego wpisać co następuje:

w art. 1. Firma Spółdzielni ma brzmieć: „Białoruska Spółdzielnia Spożywców „Odrodzenie" w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami".

W art. 5. Terenem działalności Spółdzielni iest gmina Hołyńska, a siedzibą wieś Piereczy.

W art. 10 punkt a. Członkowie są obowiązani wpłacić wpisowe w wysokości zł. dwa.

W art. 12. Udział wynosi zł. piętnaście, w czem obowiązkowa wkładka płatna gotówką przy zapisaniu się do Spółdzielni wynosi zł. trzy.

W art. [illegible] Rada Nadzorcza składa się z dwanastu członków i trzech zastępców.

Uzupełniony w powyższy sposób statut wzorowy, został w całości przez Walne Zgromadzenie przyjęty i przez członków założycieli podpisany.

Stosownie do art. 22 wybrano w głosowaniu tajnem: na członków Rady Nadzorczej p. p. 1) Michał Czaczotka zam. we wsi Piereczy gm. Hołyńskiej głosow 49, 2) Joakim Ruchlawy zam. we wsi Piereczy, głosów 47, 3) Michał Lebieda w. Piereczy, głosów 47, 4) Leon Socha w. Piereczy głosów 44, 5) Bazyl Czorny w. Piereczy, głosów 41, 6) Jan Boroda w. Piereczy. głosów 41, 7) Aleksy Drozd w. Kozły, gm. Hołyńskiej, głosów 41, 8) Mikołaj Siniawa w. Kozły, głosów 40, 9) Grzegorz Drobny w. Kozły, głosów 38, 10) Jan Horki w. Bodziawki gm. Hołyńskiej, głosów 38 11) Dziemjan Sipucha w. Bodziawki, gł. 38, 12) Tomasz Soład w. Bodziawki, gł. 37; na zastępców p. p. 1) Dziemjan Wialiki w. Piereczy, gł. 35, 2) Szymon Kolada w. Piereczy, gł. 35 i 3) Arsenjusz Prytki w. Piereczy, głosów 34.

Jednocześnie uchwalono upoważnić zarząd do zarejestrowania statutu i poczynienia w nim tych zmian, jakich ewentualnie może zarządać Sąd Okręgowy.

Upoważniono Zarząd do zaciągnięcia pożyczki na wydatki, związane z zakupem towarów do wysokości zł. 1000.

Po wyczerpaniu porządku obrad i odczytaniu niniejszego protokółu przewodniczący zamknął zebranie o godz. 16-ej

Przewodniczący Zgromadzenia
Leon Sacha

Assesorowie: (1. Dziemjan Wialiki.
(2. Szymon Kolada.

Sekretarz Bazyl Czorny.

Członkowie - założyciele: Michał Lebieda, Tomasz Soład, Grzegorz Drobny, Michał Czaczotka, Arsenjusz Prytki, Jan Horki.

Весяло гутарачы і радуючыся, што нарэшце зроблены вялікі пачатак вялікае справы, сяляне поўныя цьвёрдае веры ў лепшую, будучыню, пачалі памаленьку расходзіцца дамоў. Асталіся толькі сябры нававыбранае Нагляднае Рады, якія пасля кароткага адпачынку пачалі рабіць паседжаньне Рады з наступным парадкам дня: 1) выбары старшыні і сэкратара Рады, 2) Выбары сяброў Управы Каапэратывы і 3) Бягучыя справы.

А 17 гадзіне сябра Рады Дзям'ян Сіпуха, як чалавек старэйшы гадамі за ўсіх сяброў, адчыніў паседжаньне і запрапанаваў выбраць старшыню і сэкратара. Тайным галасаваньнем аднагалосна аказаліся выбранымі: на старшыню Рады сябра Тамаш Солад і на сэкрэтара сябра Рыгор Дробны. Потым прыступілі да выбараў сяброў Управы. Галасавалі таксама тайна і большасьцю галасоў аказаліся выбранымі: 1) Аляксей Дрозд, 2) Васіль Чорны і 3) Піліп Кохна. На гэтым паседжаньне было закончана і напісаны наступнага зьместу пратакол:

PROTOKÓŁ № 1

posiedzenia Rady Nadzorczej Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie" w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami, odbytego w dniu 20 listopada 1928 r. w domie Jana Borody.

Obecni członkowie Rady Nadzorczej: 1) Czaczotka Michał, 2) Ruchlawy Joachim, 3) Lebieda Michał, 4) Sacha Leon, 5) Czorny Bazyl, 6) Boroda Jan, 7) Drozd Aleksy, 8) Siniawa Mikołaj, 9) Drobny Grzegorz, 10) Horki Jan, 11) Sipucha Dziemjan i 12) Soład Tomasz.

Posiedzenie zagaił o godzinie 17 p. Sipucha Dziemjan, jako członek starszy wiekiem i odczytał następujący porządek obrad:

1) Wybory przewodniczącego i sekretarza Rady.

2) Wybory członków Zarządu Spółdzielni.

3) Wolne wnioski.

.Ad p. 1-go.

W głosowaniu tajnem jednogłośnie zostali wybrani: na przewodniczącego Rady p. Soład Tomasz, zam. we wsi Bodziawki gm. Hołyńskiej i na sekretarza p. Drobny Grzegorz, zam. we wsi Kozły gm. Hołyńskiej.

Ad. p. 2-go.

W głosowaniu tajnem większością głosów zostali wybrani na członków Zarządu Spółdzielni pp.: 1) Drozd Aleksy, zam. we wsi Kozły gm. Hołyńskiej, głosów — 10, 2) Czorny Bazyl, zam. we wsi Piereczy gm. Hołyńskiej, głosów — 10, 3) Kochna Filip, zam. we wsi Piereczy gm. Hołyńskiej, głosów—9.

Po wyczerpaniu porządku obrad i odczytaniu niniejszego protokółu i podpisaniu przez obecnych przewodniczący zamknął posiedzenie o goch. 18 min. 30.

Przewodniczący Rady Nadzorczej
Tomasz Soład.

Sekretarz Grzegorz Drobny.

Członkowie:
1. Michał Czaczotka.
2. Joakim Ruchlawy.
3. Michał Lebieda.
4. Leon Sacha.
5. Bazyl Czorny.
6. Jan Boroda.
7. Aleksy Drozd.
8. Mikołaj Siniawa.
9. Jan Horki.
10. Dziemjan Sipucha.

Як і трэба было спадзявацца, да Управы былі выбраны адпаведныя асобы. Аляксей Дрозд чалавек знаёмы з каапэрацыяй і вельмі ею зацікаўлены, разумны і энэргічны; Ва-

Палітычная хроніка.

Заграніцай.

[illegible]ньне сэсіі Цэнтр. Выкан. К-ту СССР.

3 га сьнежня адчынена звычайная сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Радавых Рэспублікаў. Разглядацца будзе бюджэт і праект уставы арганізацыі землеробства і выкарыстваньня глебаў і інш.

СССР пераходзіць на 7-мі гадз. рабочы дзень.

У ЦВК Радавых Рэспублікаў пададзены праект дэкрэту, згодна якога ўсе большыя прамысловыя прадпрыемствы павінны ўвесьці 7-мі гадзінны дзень працы. Дзяржаўныя, каапэратыўныя і прыватныя гандлёвыя прадпрыемствы, а такжама пачтова-тэлеграфныя ўрады і самаўрадавыя інстытуцыі, павінны перайсьці на 7-мі гадз. дзень працы не пазьней 1 кастрычніка 1933 года.

СССР пpыме ўдзел на канфэрэнцыі па барацьбе з фальшыва-грашоўшчыкамі.

Заступнік народн. камісара замежных справаў Радав. Рэспублікаў—Літвінаў урадова паведаміў сэкрэтарыят Лігі Народаў, што СССР пpыме ўдзел на міжнароднай канфэрэнцыі, якую склікае Ліга Народаў у красавіку наступнага году з мэтай вышуканьня сродкаў дзеля барацьбы з фальсіфікацыяй грошаў.

Назначэньне новага пасла Нямеччыны ў СССР.

Францускaя газэта „Фігаро“ зьмясьціла вялікі артыкул у справе назначэньня Дірксэна новым паслом Нямеччыны ў СССР. Газэта з жалем сцьвярджае, што гэты новы пасол зьяўляецца вялікім староньнікам зблізьненьня Нямеччыны з Радавымі Рэспублікамі і на сваім становішчы будзе прадаўжаць кірунак палітыкі, распачаты нядаўна памёршым у Маскве б. нямецкім паслом Брокдорфом Ранцаў.

Крывавая сутычка сацыялістаў з камуністамі ў Нямеччыне.

На З'езьдзе сацыялістаў нацыяналістаў у Бохуме пачалася спрэчка. Калі дэпутат Кубэ пачаў гаварыць аб здрадзе з боку „сацыял-дэмакратаў“, пачаўся нячуваны шум, які пасьля перайшоў у крывавую бойку паміж „сацыялістамі“ і камуністамі. Варожыя групы нападалі адзін на другога з крэсламі, [illegible] і бутэлькамі. Былі выкліканы паліцыя і пажарнікі, якім пасьля вялікіх перашкодаў удалося ліквідаваць сход. Каля 30 чалавек цяжка ранена. На падлозе і сьценках салі відаць плямы крыві.

Кітайскія вышэйшыя ўрадоўцы на студ[illegible]ях у Бэрліне.

Кітайскі ўрад прыслаў 30 вышэйшых урадоўцаў да Бэрліну дзеля атрыманьня ведаў у галіне дзяржаўнай [illegible] самаўрадавай арганізацыі дзяржавы.

Як бачым, [illegible] адносіны між Кітаем і Нямеччынай [illegible] [illegible]язам пабольшваюцца.

Работніцкія д[illegible] Букарэшце.

25 лістапада [illegible] работнікі наладзілі [illegible] дамагаючыся звальне[illegible]ньняў. Дэманстранты прайшлі праз места і падыйшлі да каралёўскага палацу. Тут загарадзіла ім дарогу жандармэрыя. Галоўны пракурор заклікаў дэманстрантаў разыйсьціся. Дэманстранты не зрабілі гэтага і пабілі пракурора. Жандармэрыя і войска разагналі натаўп. Шмат арыштаваных.

4.000 індускіх сялян ляжаць на зямлі на знак пратэсту проціў вялікіх падаткаў.

Якіх толькі спосабаў ня ўжывае працоўная бедната, каб задэманстраваць сваё нездаваленьне проціў пануючых парадкаў. Газэты падаюць сэнсацыйную вестку аб тым, як у Індыі 4.000 сялян палажыліся плашмя на зямлі перад палацам магараджы на знак пратэсту проці пабольшаньня зямельных падаткаў. Гэтых дэманстрантаў кормяць свае які і знаёмыя, якія прыносяць ім яду два разы ў дзень.

Магараджа два разы загадваў дэманстрантам апусьціць пляц каля яго палацу, але 4.000 сялян станоўча заявілі, што будуць так ляжаць перад палацам да тэй пары, пакуль не памруць, або дачакаюць зьніжэньня падаткаў,

Ужо пяты дзень, як дэманстранты ляжаць на зямлі і да гэтай пары парадак сярод іх ня быў нарушаны.

Стойкасьць індускіх сялян належыць толькі вітаць!

Анты-англійскія дэманстрацыі ў Індыі прадаўжаюцца.

З Бомбэю даходзяць весткі, што варожыя дэманстрацыі індусаў проці Англіі ня спыняюцца. У адным з большых местаў Індыі адбыліся на вуліцах бойкі паміж індусамі і англійскай паліцыяй. Шмат раненых, а паміж імі і сэкрэтар Індускага Нацыянальнага Камітэту. Становішча ў Індыі вельмі напружанае.

Вялікае землятрасеньне ў Паўдзённай Амэрыцы.

У суботу 1-га сьнежня ў рэспубліцы Чылі здарылася вялікае землетрасеньне, якое ў працягу двох наступных дзён паўтаралася некалькі разоў. Збурана 12 местаў. Забіта больш 300 чалавек і некалькі сот ранена. Жыхары ваколічных местаў і вёсак жывуць пад адкрытым небам у полі.

Крывавыя антыўрадавыя дэманстрацыі ў Югаславіі.

1-га сьнежня Югаслаўскі ўрад абходзіў 10-я ўгодкі злучэньня Сэрбіі, Харватыі, Славэніі і Чорнагорыі ў адну дзяржаву — Югаславію. Харваты, якія аддаўна імкнуцца да адлучэньня ад Сэрбіі, зрабілі з гэтай прычыны варожую да Сэрбіі дэманстрацыю. Па вуліцах Загрэбя праходзілі дэманстранты з харвацкімі нацыянальнымі сьцягамі, якія на знак жалобы былі прыкрыты чорнымі стужкамі.

А 9 гадз. раніцай па загаду ўраду павінна было адбыцца набажэнства ў кафэдральнай царкве ў Загрэбе. Перад пачаткам гэтага набажэнства 3 х студэнтаў падняліся на вышкі царквы і павесілі тры жалобных сьцягі. На сярэднім сьцягу быў намаляваны гэрб Харватыі, а на сьцягах з бакоў: „Памятайце дзень 20 чэрвеня 1928 г.“. (Як вядома, у гэты дзень у Скупшчыне (сойме) на паседжаньні былі забіты два харвацкіх паслы і сьмяротна ранены правадыр харватаў Сьцяпан Радзіч). Калі натаўп, які сабраўся на пляцы каля царквы, пабачыў на вышках царквы сьцягі, пачаў пяяць песьні на чэсьць Харватыі. Зьявіліся плякаты з варожымі да белградзкага ўраду надпісамі. З натаўпу былі чутны выкрыкі: „Далоў войска“! „Хай жыве незалежная і самадзельная Харватыя!“ і інш.

Паліцыя арыштавала некалькі студэнтаў. Калі паліцыянты хацелі адвесьці студэнтаў да ўраду паліцыі, натаўп кінуўся на паліцыю з мэтай адбіць арыштаваных. Паліцыя пачала страляць. На паліцыю пасыпаўся град каменьняў. Калі надыйшлі паліцэйскія рэзэрвы, пачаўся фармальны бой паміж натаўпам і паліцыяй. Паліцыя страляла ў людзей, пры чым аддала каля 100 стрэлаў. Забіта 5 чалавек; у тым ліку 1 студэнт і два паліцыянты і шмат ранена.

Дэманстрацыі прадаўжаліся да позьняй пары вечарам. Паліцыя і жандармэрыя абкружыла ўнівэрсытэт, у якім зачынілася каля 500 студэнтаў. Дзяржаўны Югаслаўскі сьцяг зьнішчаны, а на яго месца вывешана жалобны. Паліцыя абстрэлівала ўнівэрсытэт. Забіта аднаго і некалькі ранена.

Дык вось, як цяжка ўтрымаць пад прымусам народ, які рвецца да волі.

Характэрная прамова былога літоўскага ваеннага міністра.

Толькі-што вышаўшы у адстаўку ваенны мін. Літвы ген. Даўкантас высьветліў у спэцыяльнай гутарцы з журналістамі прычыны сваей адстаўкі. Адстаўка мін. зусім ня выклікана якой-небудзь нязгодай міністра з рэштай ураду і яго прэм'ерам, Наадварот: мін. цалком падзяляе палітыку ўраду Вальдэмараса. Ген. Даўкантас выйшаў у адстаўку — каб працаваць над стварэньнем гандлёвага флёту Літвы, разбудовы яе партоў і вадзяных шляхоў. Ген.—побач з тым — мае прыняць найбліжэйшае ўчасьце ў працы над рэформай арміі. Ген. Даўкантас асабліва салідарызуецца з загранічнай палітыкай Вальдэмараса, у частцы—з яго палітыкай адносна да Польшчы. „Мы ня хочам, заключыў ген. гутарку,—паўтараць памылкі нашай гісторыі: мы ня хочам уніі з Польшчай. Не жадаем мы і задалёка пасоўвацца на ўсход. Калі мы будзем пабіты, дык лепш нам пылягчы з аружжам у руцэ, чым падацца пераможцу“...

Крывавыя 10-тыя ўгодкі існаваньня Югаславіі ў Харватыі.

1/XII—дзень 10-тых угодкаў існаваньня злучанага „Сэрба-Харвата-Славенскага Каралеўства“ па загаду з Белграду павінен быў быць урачыста сьвяткаваны па ўсім абшары каралеўства. Але, нажаль, сэрбскі Белград ня здолеў зрабіць, каб гэта афіцыяльнае сьвята злучэньня трох пакрэўных народаў запраўды было ўсенародным, сваім і дарагім для ўсіх народаў Югаславіі.

Як ведама, уся злучаная „радыкальна-сялянская апазіцыя“ ўсіх трох народаў абвясьціла, што—ня будзе сьвяткаваць гэтага дня ўгодкаў, які лічыць толькі афіцыяльнай урачыстасьцяй чыноўніцка-цэнтралістычнага Белграду, з яго сэрбска-нацыяналістычным урадам.

Таму ў дзень гэтага сьвята ў сталіцы Харватыі мелі месца вялікія забурэньні, у часе якіх некалькі асобаў было цяжка ранена. На ўрадавыя заклікі да сьвяткаваньня, апазіцыя адказала заклікам да байкоту. У дзень урачыстасьці на Загрэбскай катэдры вывешаны былі 3 жалобныя сьцягі. Калі раніцай пачаліся па загаду ўраду ўрачыстыя сабраньні з выкладамі ўва ўсіх школах, групы студэнтаў-харватаў урываліся ў школы і спынялі выклады. Калі паліцыя ўмешвалася, арыштоўваючы спраўцаў байкоту, распачалася бойка паміж паліцыяй і таўпой, якая пачала адбіваць арыштаваных. І вось, у часе страляніны і было некалькі раненых. Такім чынам у Харватыі запраўды-ж „сьвята Югаславіі“ аказалася, ня толькі сьвятам чыста афіцыяльна-чыноўніцкім, але і днем нацыянальнай жалобы для харватаў... А ўсё робіць гэта сэрбская буржуазія са сваімі прыслужнікамі, якая ўсьцяж хоча панаваньня над харвацкім народам, але ня хоча — сужыцьця з ім—на правох волі і роўнасьці.

Як ведама, падобныя здарэньні адбыліся і ў іншых паваенных дзяржавах — на сьвяткаваньні ў іх „дзяржаўнымі народамі“ 10-тых угодкаў панаваньня над „не дзяржаўнымі“...

Францускі ген. Лерон у Белградзе.

Францускі генарал, які ўсьцяж аб'яжджае сталіцы ўсіх „васcальных“ дзяржаваў Францыі, да якіх—пасьля апошняга „англа-францускага кампрамісу“ — належаць амаль ня ўсе „не вялікія“ дзяржавы Заходняй Эўропы, апынуўся ў апошнія дні ўжо і ў Белградзе. Як ведама, з Бухарэшту, з Рыгі, з Прагі нядаўна пасыпаліся вельмі алярмуючыя, ня ведама, насколькі праўдзівыя, інфармацыі аб тым, быццам гэты францускі штабавік аб'яжджае ўздоўж усю „лінію фронту“ дзяржаваў — „ад мора да мора“, падрыхтоўваючы вялікую коаліцыю проці Радаў. Інфармацыі гэтыя выклікалі велізарную трывогу ў сьвеце. Таму нічога дзіўнага, што югаслаўскае міністэрства загранічных спраў заразжа пасьпяшыла згары ўжо запярэчыць усялякім падазрэньням адносна да візыты ген. Лерона ў Белградзе, заяўляючы, што—візыта францускага ген. не датычыць акцыі, скіраванай проці СССР, а мае выключна сувязь з балканскімі справамі, якімі цікавіўся п. Лерон на мейсцы. Генарал, сцьвярджае тэлеграма, вёў сэкрэтныя гутаркі з павадырамі партыяў і сябрамі ўраду, а таксама быў прыняты каралём.

Новы паварот у прамысловым канфлікце ў Нямеччыне.

Нямецкі ўрад назначыў новага „палюбоўнага судзьдзю“ ў канфлікце паміж работнікамі і працадаўцамі — у вугальнай і тканіннай прамысловасьці. Судзьдзёй гэтым зьяўляецца мін. унутр. спраў сацыял-дэмакрат Зэвэрынг. Абедзьве стораны згадзіліся прызнаць пастанову мін. Зэвэрынга. Нацыяналістычная прэса страшэнна лае прамыслоўцаў, якія пайшлі згары на „капітуляцыю перад работнікамі“, прызнаўшы такога „староньняга судзьдзю“. З другога боку—камуністычная прэса падчырквае „задзіўляючае даверра“ прамыслоўцаў да „бесстароннасьці гэтага судзьдзі—міністра—сацыял-дэмакрата“

Адным махам—2.400 самалётаў...

Амэрыка, якая дагэтуль не канкуравала ў збраеньнях з Эўропай, хоча цяпер адразу стаць першай ваенна-марской і паветранай дзяржавай сьвету. Пасьля апрацаваньня „вялікай марской праграмы“, выкананьне якой адразу адбярэ ад Англіі яе выключнае панаваньне на акіянах, толькі-што апублікавана „бягучая праграма“ будаваньня паветранага флёту, прадбачучая, як „першую порцыю“,—2 400 ваенных аэрапляпаў... Вось, гэта дык—паамэрыканскі, дый—у чэсьць „кэлёгавага трактату—аб вечным міры.

сіл [illegible] пісьменны, талковы і праца[illegible]ма-вельмі сумленны і разумн[illegible]м сьвядомыя і шчырыя [illegible]ляжвага народу; ўсе [illegible]ы, што ў будучыні [illegible]я зробіць вялікі по[illegible] культура падымецца і [illegible]

[illegible]бры Ураду свае аба[illegible] А. Дрозд — старшыня [illegible]ы, В. Чорны — сэкратар і [illegible]ік.

[illegible] скончыліся ўсе фармальнась[illegible] Спажывецкае Каапэратывы ў [illegible]ючы, якія вымагаюцца ўставамі і [illegible] Дзеля таго, каб новапаўстаўшая [illegible]зацыя лічылася інстытуцыяй праўнай, трэба яшчэ зарэгістраваць у Акружным Судзе. Да гэтага зараз-жа і прыступіла Управа. Напісалі дзьве копіі статуту, прынятага на сходзе і падпісанага сябрамі—закладчыкамі, копію пратаколу Арганізацыйнага Сходу і копію пратаколу першага паседжаньня Нагляднае Рады. Усе гэтыя копіі, як падаецца ніжэй, былі заверaны Управай Каапэратывы:

Odpis.

STATUT

Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach.

1. Nazwa, cel, teren działalności i siedziba.

Art. 1. Spółdzielnia posiada nazwę: „Białoruska Spółdzielnia Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami“ i zostaje związana . . . .

(усё тое самае, што і ў арыгінале) . . . . .

Członkowie założyciele: 1) (—) Aleksy Drozd, zamieszkały we wsi Kozly gm. Hołyńskiej, 2) (—) Jan Boroda, zam. we wsi Piereczy gm. Hołyńskiej, 3) (—) Michał Lebieda, zam. we wsi Piereczy gm. Hołyńskiej, 4) (—) Bazyli Czorny, zam. we wsi Piereczy gm. Hołynskiej, 5) (—) Michał Czaczotka, zam. we wsi Piereczy, 6) (—) Joachim Ruchlawy, zam. we wsi Piereczy, 7) (—) Mikołaj Siniawa, zam. we wsi Kozły gm. Hołyńskiej, 8) (—) Grzegorz Drobny, zam. we wsi Kozły, 9) (—) Tomasz Soład, zam. we wsi Bodziawki gm. Hołyńskiej 10) (—) Dziemjan Sipucha, zam. we wsi Bodziawki, 11) (—) Jan Horki, zam we wsi Bodziawki, 12) (—) Leon Sacha, zam. we wsi Piereczy, 13) (—) Arsenjusz Prytki, zam. we wsi Piereczy, 14) (—) Dziemjan Wialiki, zam. we wsi Piereczy gm. Hołyńskiej.

Zgodność z oryginałem stwierdza się:

Zarząd Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami:

Aleksy Drozd, Filip Kochna, Bazyl Czorny.

Гэтакіх копіяў статуту, як сказана вышэй, было зроблена дзьве. Проста было ўзята дзьве друкаваныя кніжачкі статуту, на першай старонцы направа угары было напісана „odpis“ і далей дапісана ўсё тое, што і ў арыгінале.

Далей ідуць копіі пратаколаў:

Odpis.

PROTOKÓŁ

Walnego Zgromadzenia Założycielskiego Spożywców we wsi Piereczy, gminy Hołyńskiej, pow. Wileńskiego z odpowiedzialnością udziałami, odbytego w dniu 20 go listopada 1928 r. w domie № 45 Jana Borody. Zgromadzenie zagaił o godzinie 12 w poł. Michał Lebieda . . . . (усё з парадку перапісаць, як у арыгінале, не адступаючы і не пачынаючы з новых строк) . . . . i po odczytaniu niniejszego protokołu przewodniczący zamknął zebranie o godzinie 16-tej. Przewodniczący Zgromadzenia (—) Leon Sacha, Assesorowie: 1) (—) Dziemjan Wialiki, 2) (—) Szymon Kolada, Sekretarz (—) Bazyl Czorny, Członkowie-założyciele: (—) Michał Lebieda, (—) Tomasz Soład, (—) Grzegorz Drobny, (—) Michał Czaczotka, (—) Arsenjusz Prytki i (—) Jan Horki.

Zgodność z oryginałem stwierdza się:

Zarząd Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami:

Aleksy Drozd, Filip Kochna, Bazyl Czorny.

Odpis.

PROTOKÓŁ № 1

posiedzenia Rady Nadzorczej Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami, odbytego w dniu 20-go listopada 1928 roku w domie Jana Borody. Obecni członkowie Rady Nadzorczej: 1) Czaczotka Michał . . . . (усё з парадку перапісаць, як і ў [illegible]гінале, не адступаючы і не пачынаючы [illegible] радкоў) . . . . i po odczytaniu niniejszego [illegible] przez obecnych, przewodni[illegible] dzenie o godz. 18-tej m. 30 [illegible] Rady Nadzorczej (—) Tomasz [illegible] kretarz (—) Grzegorz Drobny, Członkow[illegible] 1) (—) Michał Czaczotka, 2) (—) Joachim Ruchlawy, 3) (—) Michał Lebeda, 4) (—) Leon Sacha, 5) (—) Ba[illegible] Czorny, 6) (—) Jan Boroda, 7) (—) Aleksy Dr[illegible] 8) (—) Mikołaj Siniawa, 9) (—) Jan Horki, 10) (—) Dziemjan Sipucha.

Zgodność z oryginałem stwierdza sie:

Zarząd Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach z odpowiedzialnością udziałami:

Aleksy Drozd, Filip Kochna, Bazyl Czorny.

Усе гэтыя напісаныя і зацьверджаныя Управай Каапэратыву копіі былі далучаны да прашэньня наступнага зьместу:

Do
Sądu Okręgowego jako Rejestrowego
w Wilnie.

Niniejszym prosimy na zasadze art. 7 ustawy o spółdzielniach z dnia 29.X 1920 r. o wciągnięcie do rejestru spółdzielni, Białoruską Spółdzielnię Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach gm. Holyńskiej z odpowiedzialnością udziałami.

Do niniejszego załączmy:

1. Statut spółdzielni Spożywców w Piereczach, przyjęty na Walnem Zgromadzeniu w dniu 20 listopada 1928 r.

2. Dwa odpisy statutu.

3. Odpis protokółu Walnego Zgromadzenia.

4. Odpis protolółu № 1 posiedzenia Rady Nadzorczej, na którem wybrano Zarząd.

Za spółdzielnię będzemy podpisywać jak niżej: „Białoruska Spółdzielnia Spożywców „Odrodzenie“ w Piereczach z odpowiedzialnoscią udziałami“ Członkowie Zarządu: Aleksy Drozd, Filip Kochna, Bazyl Czorny.

Dnia 22 listopada 1928 r.

wieś Piereczy, poczta Hołynka.

Гэтае прашэньне сябры Ураду адразу не падпісвалі, а схадзілі з ім або да Натарыюса, або да ўпаважненага Міравога Судзі, або да Войта свае гміны і там у прысутнасьці яго расьпісаліся, як паказана вышэй, і падпісы іх былі зацьверджаны:

Zaświadczam niniejszym tożsamość osób i własnoręczność podpisów: 1) Aleksego Drozda, 2) Filipa Kochnę i 3) Bazylego Czarnego.

Пратаколы паседжаньня Агульнага Сходу, Нагляднае Рады пішуцца папольску дзеля таго, што Акружны Суд можа патрэбаваць тлумачэньня з беларускага і гэта зацягне справу. У далейшым жа трэба ўсе пратаколы, а таксама ўсю канцэлярыю і бухгальтэрыю весьці пабеларуску.

Гэтае прашэньне з усім вымаганымі далучнікамі і коштамі рэгістрацыі 4 злоты, кошты абвесткі ў газэтах 52 зл. 65 гр., разам—56 зл. 65 гр. сябры Ураду пераслалі ў Суд.

Такім чынам у вёсцы Пярэччы паўстаў Каапэратыў і даўно жаданныя думкі зьдзейсьніліся.

А. Васіленя.

Вільня, 2/XII. 1928 г.

(Канец).

Наша хроніка.

Канфіската. Па загаду Старосты Гродзкага на м. Вільню сканфіскаваны № 3 газ. „Да Працы“ 1) за перадав.—„Угода“, 2) стацьцю — „Будучыня нашых лясоў“, 3) заметку з палітычнай хронікі — „Дзікая забастоўка“ і 4) заметку з нашай хронікі—„З працэсу сьпіртовай афэры“.

Агульны Сход Дабрадзейнага Т-ва. Даводзіцца да ведама ўсіх сяброў Беларускага Дабрадзейнага Т-ва, што 19-га гэтага сьнежня, а 5-ай гадз. увечары, у памяшчэньні Віленскай Беларускай Гімназіі адбудзецца паседжаньне Агульнага Сходу Дабрадзейнага Т-ва.

Павестка дня: 1. Прыймо новых сяброў Т-ва і выключэньне старых. 2. Гадавая справаздача Т-ва. 3. Перавыбары Прэзыдыуму і Рэвізійнае Камісіі Т-ва, і 4. Бягучыя справы.

У выпадку адсутнасьці кворуму а 5-ай гадз. увечары, паседжаньне Агульнага Сходу Т-ва адбудзецца праз гадзіну ў той-жа дзень, г. зн., а 6-ай гадзіне ўвечары і будзе лічыцца правамочным пры ўсялякім ліку сяброў.

Прэзыдыум Т-ва.

Залажэньне Спажывецкае Каапэратывы „Новы Сьвет“ у Вільні. Арганізацыйны Сход сяброў-закладчыкаў адбыўся дня 16 кастрычніка 1928 г. у памешканьні Віл. Каапэр. Банку на Віленскай вуліцы № 8 а гадз. 7 увечары. Прысутных было 14 асоб. Статут быў прыняты з наступнымі дабаўкамі: упісовыя—2 зл., пай — 25 зл., Наглядная Рада складаецца з 6 асоб.

У гэтым самым дню было паседжаньне Нагляднае Рады новастворанага Каапэратыву, на якім адбыліся выбары Ураду, — старшыня Хвалько Міхал, скарбнік Смолік Міхал і сэкратар Рэшатаў Уладзімір.

Зачыненьне белар. „Круцёлкі“. Як паведамляе 23 нумар „Грамадзяніна“, улады адмовілі паўлюкевічаўскай „Беларускай Хатке“ ў выдачы канцэсіі на трыманую ёю круцёлку (лёто). Апроч гэтага, улады яшчэ адмовілі просьбе 42 працаўнікоў гэтай круцёлкі аб працягу канцэсіі на адзін дзень (1 г. м.) „дзеля поўнага разрахунку“.

Аднак, як піша названы „Грамадзянін“, „хоць гэтая просьба была згодна з законам, ваяводзкія ўлады „cofnęli“ (Курс. „Грам“) яе без усялякіх прычынаў і цяперака, дзякуючы адмове, якраз на зіму і перад сьвятамі 42 працаўнікі асталіся звольненымі бяз ніякай дапамогі“.

Як відаць, загадчыкі шулерні ўжо не патрэбны.

Прыкладная забастоўка. 1 г. м. у фабрыцы Бальбэрыйскага ў Н.-Вялейцы быў звольнены адзін работнік. З гэтай прычыны рэшта работнікаў — 120 чалавек, — абвясьцілі забастоўку, дамагаючыся адначасна прыняцьця свайго звольненага сябра. Першая канфэрэнцыя работнікаў з дырэкцыяй не дала ніякага рэзультату. Работнікі заявілі на ёй, што прыступяць да працы толькі па прыняцьці звольненага работніка. 4 г. месяца дырэкцыя згадзілася на гэты варунак і работнікі, разам са звольненым сябрам, вярнуліся да працы.

З салі Віл. Акруж. Суда. Надовячы ў Акружным Судзе ў Вільні разглядалася справа нейкага Якуба Розэнбэрга, абвінавачванага ў прыналежнасьці да Акр. Кам. КПЗБ у Вільні і ў цэлым радзе іншых камуністычных спраў. Абвінавачваў падпрак. Раўзэ, бараніў адв. Дурач.

Абвінавачаны ў апошнім сваім слове выказаў 2 гадзінную прамову на тэму значэньне камуністаў у буржуазных дзяржавах.

Розэнбэрг засуджаны на 12 гадоў цяжкай турмы, 1 год турмы за ўжываньне фальшывага пашпарту і 3 гады дому папраўы за падрабеньне вайсковай кніжкі. Прыгавор засуджаны прыняў спакойна. (К. W. № 272).

Вёска Кракотка Слонімскага павету. Каапэратыў Спажывецкі заложаны ў лютым 1928 г., крама існуе таксама з лютага 28 г. Каапэратыў разьвіваецца добра.

Прысьпяшэньне паліцыйных даходжаньняў. Віленская прэса інфармуе, што Каманда паліцыі выдала загад, які мае прысьпяшыць паліцыйныя даходжаньні (сьледзтва).

Праектуецца такжа і ўпрашчэньне фармалістыкі сьледзтва.

З вучнёўскай Акадэміі В. Б. Г. У суботу 1-га сьнежня вучні Віл. Бел. Гімназ. ладзілі Акадэмію, пасьвячоную памяці Паўлюка Бахрыма першага беларускага селяніна-паэта (100-тыя ўгодкі) і 55 угодкаў сьмерці Кастуся Каліноўскага, першага змагара за незалежнасьць працоўнай Беларусі („у маей Беларусі шляхты няма — усе роўныя“,— мова Каліноўскага над шыбеніцай).

Акадэмію адчыніў уступнаю прамовай дырэктар Віл. Бел. Гімназіі грам. Стэцкевіч.

Далей шырэйшую цікавую прамову, прысьвечаную, галоўнае, Бахрыму, сказаў гр. Луцкевіч, у часе якой прысутнае грамадзянства ўшанавала памяць усіх нашых Бахрымаў і Каліноўскіх (як казаў прамоўца) выслуханьнем хаўтурнага марша, стоячы. Чародна, вучань 8 клясы В. Б. Г., Язэп Урбановіч, прачытаў рэфэрат, прысьвечаны К. Каліноўскаму.

Як грам. Луцкевіч, так і вучань-рэфэрэнт, даўшы прысутнаму грамадзянству проста мастацкія малюнкі нашай нялюдзкай прошласьці, далі яму гэтым самым і абразкі нашай будучыні, ці, вярней, указалі прысутным той калючы шлях, па якім ўжо даўно йдзе працоўны беларускі народ і па якім павінны йсьці і мы, каб „здабыць навуку і стацца людзьмі“, як казаў в. п. Каліноўскі.

Гэтую думку, як адбітак масавага імкненьня беларускага народу да людзкага жыцьця, яшчэ больш паглыбіла сцэна, на якой былі згуляны вучнямі гімназіі абразкі з жыцьця К. Каліноўскага, узятыя з паэмы „Кастусь Каліноўскі“, Вольнага і прыстасаваныя дзеля сцэнічнай пастаноўкі ў гэты дзень.

Гэтыя трагічныя абразкі балюча прыпомнілі кожнаму беларусу крывавы і цяжкі шлях нашага народу...

Пасьля адбылася дэклямацыя маладых беларускіх паэтаў: Бартуля, Тулейкі і Сарокі, якія дэклямавалі ўласныя вершы, прысьвечаныя першаму змагару і трагічна памёршаму за незалежную роўную Беларусь К. Каліноўскаму. Апрача таго, вучні гімназіі дэклямавалі вершы старэйшых беларускіх паэтаў, — асабліва добра дэклямавала вучаніца Шутавічанка Ганна верш Я. Купалы: „Над Нёмнам“. Апошнім выступіў вядомы ўжо ўсім гімназіяльны хор, пад кіраўніцтвам грам. Шырмы. Хор, як заўсёды, выпаўніў сваю ролю надта добра, пры чым было выканана некалькі новых песьняў.

На заканчэньне Акадэміі хор і ўсе прысутныя прапялі нацыянальны гімн: „Ад веку мы спалі“.

Наагул, Акадэмія прайшла дужа ўрачыста, робячы на прысутных вельмі прыемнае ўражаньне, ня толькі сваім унутраным зьместам, але і вонкавым выглядам і выкананьнем, прыгожа, хоць і скромна ўдэкараваная сцэна з вялікім партрэтам Каліноўскага (работа маладога беларускага мастака Васілеўскага) так і самая пастаноўка — усё было прасягнута шчырай увагай і праўдзівым каханьнем сярмяжных сыноў да няделі іх гаротнага народу.

Зразумела, што бясканечныя воплескі і захопленьне тут ня дзіўная і ня новая рэч...

Мусім яшчэ адзначыць, што, ня гледзячы на такую важную хвіліну ў гісторыі Адраджэньня Бел. Народу, ня ўсе „паважаныя „асобы“ ўшанавалі яе сваею прысутнасьцю“, як напр., грам. Астроўскі, які быў у гімназіі, але не на Акадэміі.

Як пасьля высьветлілася, прычына адсутнасьці гэтай „высокай“ асобы тая, што ўся моладзь — як вучні так і студэнты — рашуча запратэставалі проці запрашэньня грамадзян. Астроўскага ў склад прэзыдыуму Акадэміі.

І гэта зразумела. Ня можна зьневажаць сьветлай памяці герояў-мучанікаў за народную волю прысутнасьцяй таго, хто выразна і адкрыта стаў на шлях здрады і прадажніцтва свайго народу.

Трэба яшчэ крыху застанавіцца і над тым проста дзіўным зьявішчам, што, не ўважаючы на сумную, навет трагічную тэму Акадэміі, Сель-Саюз наладзіў зараз-жа па ёй у салі „Інст. Бел. Гасп. і Культуры“ скокі.

Вось дык „Інстытут Культуры“—робіць на хаўтуры змагароў Белар. Народу скокі!...

Падзяка. Беларускае Навуковае Т-ва складае шчырую падзяку наступным арганізацыям і асобам за прысланыя праз Белар. Каапэрат. Банк у Вільні на тэрміновы рахунак № 17 ахвяры і складкі на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні“ (сумы паказваюцца за ўтрыманьнем паштовых расходаў на дастаўку): 1) Андрэю Пазняку — 9 зл. 95 гр.; 2) работнікам з Горадзеншчыны, працуючым у Варшаве, імянна: К. Бакацю, Ахруну А., Кнізе А., Кавэцкаму С., Ванюкевічу Д., Ванюкевічу Т., Майсаку І. і Шкуце Н., ахвяраваўшым усяго 12 зл. 40 гр.; 3) гр. Сінкевічу з Шантараўшчыны, Дзісьнен. пав. — 2 зл.; 4) дэлегатам Горадзенскага З'езду Т-ва Бел. Шк. (паіменны сьпіс дэлегатаў надрукованы ў „Слове Працы“ ад 24.X 1928 г № 7) — 26 зл. 60 гр.; 5) вязьням — грамадаўцам з Грудзёндзу, прыслаўшым праз б. пасла П. Мятлу — 31 зл. 80 гр. (у пісьме ёсьць такі ўступ: „верым, што „Народ сам сабе“ збудуе „Дом. Бел Культ.“; 6) перанесена з бягучага рахунку № 4 на рахунак „Дому Белар. Культуры ў Вільні“ сабраных ад 1923 году Бел. Навуковым Т-вам на дом для Беларускага Музэю — 1532 зл. 78 гр.; 7) В. Антановічу — 5 зл. [illegible] 8) Аб'яднаньню Беларускіх Студэнтаў [illegible] у Празе Чэскай—91 зл. [illegible] Бэнькоўскаму — 50 гр. [illegible] лістапада сабрана 9117 зл. 90 [illegible] Урад Навуковага Т-ва.

[illegible] Т-ва Бел. Школы.

З працы Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

— 14-га кастрычніка г. г. Кацьмінаўскім Гуртком Т-ва Бел. Школы быў наладжаны ў в. Кацьмінаўцах спэктакль. Адыграна была драма „Страхі жыцьця“ — А. Аляхновіча, прадэклямавалі некалькі беларускіх вершаў (цікава, што Баранавіцкі Староста не дазволіў дэклямаваць верш Я. Купалы—„Прарок“), апроч таго, хор прапяяў песьню „Ой, не хадзі, Грыцу“ (у беларускай мове). Публіка (пераважна вясковая бедната) запаўняла ўсю залю. Шмат каму не ўдалося пралезьці, бо ня было мейсца.

На спэктаклі былі прысутныя нашыя паважаныя паслы Гаўрылік і Валынец, запрошаныя проста з мітынгу, які адбыўся ў той самы дзень у асадзе Жалезьніца. Прысутнасьць нашых абаронцаў рабіла вельмі добрае ўражаньне на артыстаў і публіку, чулася блізкая сувязь, расла надзея і вера ў добрыя пачынаньні нашай рваўшайся да асьветы моладзі. Трэба, каб за прыкладам Кацьмінаўскага Гуртка Т-ва Белар. Школы пайшлі і другія Гурткі вакалічных вёсак, у якіх праца амаль-што зусім спынілася, або сунецца чарапашым шагам. Чысты даход у суме 51 зл. 20 гр. пойдзе на адкрыцьцё бібліятэкі-чытальні.

— 27-га верасьня г. г. Мала-Галіцкім Гуртком Т-ва Белар. Школы быў наладжаны ў в. Сасноўцы, Дзевяткаўскае гм., спэктакль, на якім былі згуляны наступныя п'есы: „Мікітаў лапаць“—М. Кудзелькі і „Зьбянтэжаны Саўка“—Л. Родзевіча. Меліся згуляць яшчэ „Лекары і лекі“, але з прычыны арышту аднаго з артыстаў не маглі гэтага зрабіць. Спэктакль прайшоў добра. Білеты былі ад 30 да 50 гр., г. зн. даступныя для найбяднейшых. Чысты даход у суме 35 зл. пойдзе на карысьць бібліятэкі-чытальні пры тым-жа гуртку.

У тым-жа дні і гэтым-жа гуртком быў наладжаны скарбонačны збор у в. Мізгірах, на карысьць бібліятэкі-чытальні ў в. Сасноўцы, у якой падчас пажару згарэла шмат кніжак. Трэба зазначыць, што Староста Слонімскі шмат разоў адмаўляўся даць дазвол на збор, адмаўляючыся тым, што няма „koniecznej potrzeby“.

Сабрана ўсяго 40 зл. 60 гр.

Усім ахвярадаўцам Мала-Галіцкі Гурток Т-ва Бел. Шк. складае шчырую падзяку.

А. Пазьняк.

— У суботу 13./X. г. г. адбыўся сход сяброў Баранавіцкага Гуртка Т-ва Белар. Школы, дзеля выбараў прадстаўнікоў на агульны зьезд Т-ва Белар. Школы ў Вільні. Між іншымі бягучымі справамі, **сход паставіў адчыніць пры Гуртку курсы беларускае мовы для дарослых.** Нажаль, ня маем адпаведных пэдагагічных сілаў.

На другі дзень 14/X адбыўся агульны зьезд прадст. ад Гурткоў Баранавіцкага пав., дзеля выбару дэлегатаў на агульны зьезд Т-ва і справаздачы аб дзейнасьці паасобных гурткоў і акружной управы.

У дакладах падчырквалі значэньне Т-ва, заклікаючы ўсіх да далейшай працы, да барацьбы з цемрай, да змаганьня за родную школу.

Пасьля дакладаў выбралі дэлегатаў.

На заканчэньне прапялі гімн: „Не загаснуць зоркі ў небе“. Цікавы.

З жыцьця Горадні.

× **Апошні магіканін за кратамі.** Гэтымі днямі застаў арыштаваны Шурпоўскі камрад Віктар Якімовіч, якога злавілі з тайнымі дакумантамі на літоўскай граніцы, дый распачалі сьледзтва проці яго з арт. III к. к. г. ё. за шпіянаж на карысьць Літвы. Няма нічога дзіўнага, што яго арыштавалі бо ў апошнія часы яго часта можна была сустрэць спацыруючым у таварыстве Шурпы дый іншых дыфэнзістаў, чаго да таго часу за ім не заўважвалася.

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што [illegible]

— **В. Трухановічы, Наваградчына.** Некалькі нашых сялян узяліся высячы [illegible] у „паньствовым“ лесе, дзе [illegible] усё дзерава і адправілі заграніцу. У працягу двох тыдняў працавалі гэтыя сяляне з сваімі сем'ямі. Загатовілі па некалькі вазоў гальля на зіму. Аднак, не ўдалося ім скарыстаць свае працы.

Бо, як толькі яны прыехалі па гальлё, дык ляснік забараніў ім браць і яшчэ напісаў пратакол.

Адбыўся суд, у выніку якога сяляне, якія працавалі па два тыдні, атрымалі [illegible] тыдні вастрогу і па дзесяць злотых судовых коштаў.

Т—разан.

— **У Маладэчанскім пав.** няма ніводнае беларускае школы, хоць жыхарства выключна беларускае. Праўда, ёсьць дзьве ўтраквістычныя, але яны нічым ня розьняцца ад польскіх. Чаму-ж так? Ці сяляне ня хочуць роднай школы? Мо' не дамагаюцца? Не! Аб гэтым сьведчыць масавае падаваньне дэклярацыяў, у некаторых вёсках (Кабыльнікі) па некалькі разоў. І што-ж? Прыедзе інспэктар, папытаецца і ад'яжджае, з чым прыяжджаў, а школы як няма, так і няма. Такое адношаньне, ясная рэч, адбівае ахвоту змагацца за родную школу. Але, браты, памятайце, што родная школа здабываецца толькі барацьбой! Дык не пакладайма рук, а ўсе, як адзін, дамагайцеся роднай школы. Пакажам, што мы не такія ўжо цёмныя і нядбалыя, як нас лічаць. Памятайце, што створым сваімі рукамі, тое будзе трывалае! Маем яшчэ не споўна месяц тэрміну для складаньня школьных дэкларацыяў.

А. Бедны.

— **Поп Хаценчыцкай парафіі,** Макар Х[illegible]дос, прымушае працаваць, як на паншчыне. За адзін пуд жыта трэба галоднаму работніку і каню працаваць цэлы дзень ад цямна да цямна, пры тым [illegible] розныя нас[illegible] мешкі гэтага абшарніка [illegible]. Але, мала таго, ён ня хоча аддаць тое, што сяляніа зарабляе. Гэтак аднаму селяніну за 3 дні катаржнай работы даў 2 пуды 25 ф., але ня жыта, а... пасьлёдкаў. Другога, Войтуся, з вёскі Загараны, калі ён прыйшоў да яго па плату за падзённую работу, схапіў гэты поп яго за каўнер і выкінуў вон.

Вось, як робяць „божыя слугі“. Ш.

— **У жыхароў [illegible] Гарманавіч Дзісьненскага пав.,** пачынае ўжо шырыцца голад. Няма чаго даць ні скаціне, ні самім зьесьці. Непагадзь і [illegible] ўлетку бедныя сялянскія палоскі, апроч таго няма дзе зарабіць. Каб уратавацца ад голаду, сяляне павінны арганізоўваць камітэты па барацьбе з голадам, дамагацца ўрадавай дапамогі, зварачвацца да другіх жыхароў, дзе быў хоць сякі-такі ўраджай — [illegible] тунку.

Рэдактар-Выдавец: М. Печка.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.